# БЕЛАРУСКАЯ МОВА І ЛІТАРАТУРА

**А. У. Амрэйчык**

## ІНТЭРПРЭТАЦЫЯ МІФАЛАГІЧНЫХ АРХЕТЫПАЎ У БЕЛАРУСКАЙ І АНГЛІЙСКАЙ ПАЭЗІІ XIX СТАГОДДЗЯ

Архетып (першавобраз) – глыбінны культурны код, які перадаецца праз міфы і фальклор. Адрозненне паміж міфалогіяй і фальклорам палягае ў тым, што міф – гэта сакральныя веды пра свет і аб'ект веры, тым часам як фальклор – гэта мастацтва, то-бок мастацка-эстэтычнае адлюстраванне свету, і верыць у яго праўдзівасць неабавязкова. Фальклор базуецца на міфалогіі. Такім чынам, фальклор – гэта не толькі пазнейшая з'ява, але і адрозны ад міфалогіі феномен.

Паводле Карла Юнга, архетып немагчыма цалкам растлумачыць, бо ён укаранёны ў калектыўнай падсвядомасці. Прыклады ўніверсальных архетыпаў:

- Змей-разбуральнік (Ёрмунганд, Врытра, Цмок).
- Праваднік у свет мёртвых (Харон, Анубіс, валькірыі).

У XIX стагоддзі рамантыкі, расчараваныя ідэямі рацыяналізма, звярнуліся да міфаў для адлюстравання духоўных і эстэтычных ідэалаў.

У беларускай літаратуры аўтары выкарыстоўвала ніжэйшую міфалогію і героямі іх твораў выступалі духі прыроды: вадзянікі, русалкі):

- «Дзяды» Міцкевіча – абрад звароту нябожчыкаў, вобразы нячысцікаў.
- «Сялянка» Дуніна-Марцінкевіча – фальклорныя персанажы і прымаўкі.

Мэта: перадача нацыянальнага светапогляду і гармоніі з прыродай.

Англамоўныя аўтары апіралася на класічную міфалогію (грэчаскія, рымскія вобразы):

- «Эндыміён» Кітса – міф пра каханне багіні Селены і смяротнага.
- «Праметэй вызвалены» Шэлі – сімвал бунту супраць тыраніі.

Мэта: даследаванне універсальных філасофскіх тэм (свабода, бунт, існаванне, сэнс жыцця).

Беларускія аўтары праз фальклорныя архетыпы падкрэслівалі сувязь з прыродай і нацыянальнай традыцыяй. Англійскія рамантыкі ўжывалі класічныя міфы для філасофскіх абстракцый. Абедзве традыцыі ўзбагацілі паэзію, стварылі класічныя ўзорныя творы, адлюстроўваючы нацыянальную ідэнтычнасць і самабытнасць праз адаптаванне архетыпаў у культурным кантэксце.